




Пераважная большасьць працытаваных біблійных тэкстаў была ўзята зь перакладу Бібліі Васіля Сёмухі і з дазволу Алесі Сёмухі; цытаты, якія адрозьніваюцца ад перакладу В. Сёмухі, указаны.

## БОГ СТВАРЫЎ УВЕСЬ СУСЬВЕТ І ЎСЁ ЖЫВОЕ 1

**“На пачатку стварыў Бог неба і зямлю”** (Быцьцё 1:1).

**“…бо Ён стварыў усё, што на нябёсах і што на зямлі…”** (Каласянаў 1:16а).

**“…дабраслаўлёныя вы Госпадам, Які стварыў неба і зямлю. Неба - неба Госпаду, а зямлю Ён даў сынам чалавечым”** (Псальма 113:23, 24).

Калі Бог даў чалавеку зямлю, яна была дасканалая. Прачытай гэтую кніжачку і даведаешся, што на самой справе здарылася.

## 2 БОГ НАС СТВАРЫЎ



**“І сказаў Бог: створым чалавека паводле вобразу Нашага, паводле падабенства Нашага; і хай валадараць яны… над усёю зямлёю…”** (Быцьцё 1:26а).

## ЧАЛАВЕК СТАЎ ДУШОЮ ЖЫВОЮ 3

**“І стварыў Гасподзь Бог чалавека з пылу зямнога і ўдыхнуў у твар ягоны дыханьне жыцьця, і зрабіўся чалавек душою жывою*”** (Быцьцё 2:7).

**“І сказаў Гасподзь Бог: нядобра быць чалавеку аднаму; створым яму памочніка, адпаведнага яму… І навёў Гасподзь Бог на чалавека моцны сон; і, калі ён заснуў, узяў адну рабрыну ягоную, і закрыў тое месца плоцьцю. І стварыў Гасподзь Бог з рабрыны, узятай у чалавека, жанчыну, і прывёў яе да чалавека”** (Быцьцё 2:18, 21, 22).

*Жывая душа – значыць, што дзесьці мы будзем жыць вечна.

## 4 АДАМ ЗЬ ЕВАЮ НЕ ПАСЛУХАЛІСЯ БОГА



Не павінны мы слухацца голасу д’ябла.

**“І ўзяў Гасподзь Бог чалавека, якога стварыў, і пасяліў яго ў садзе Эдэмскім, каб урабляць яго і захоўваць яго. І наказаў Гасподзь Бог чалавеку, кажучы: з кожнага дрэва ў садзе ты будзеш есьці; а з дрэва спазнаньня дабра і зла, ня еж зь яго; бо ў дзень, калі ты пакаштуеш зь яго, сьмерцю памрэш”** (Быцьцё 2:15-17). **5**

**ЗЬМЕЙ (ЯГО ТАКСАМА НАЗЫВАЮЦЬ Д’ЯБАЛ, ЦІ САТАНА) ПАСТАВІЎ ПАД СУМНЕЎ БОЖУЮ ЎЛАДУ І СКАЗАЎ НЯПРАЎДУ.**

**“І сказаў зьмей жанчыне: не, не памраце... І ўбачыла жанчына, што дрэва добрае для ежы, і што яно прыемнае вачам і панаднае, бо дае веду; і ўзяла пладоў зь яго і ела; і дала таксама мужу свайму, і ён еў”** (Быцьцё 3:4, 6).

## 6 АДАМУ ЗЬ ЕВАЮ БОЛЕЙ НЕ ДАЗВОЛЕНА ЗАСТАВАЦЦА Ў САДЗЕ



**“І выслаў яго Гасподзь Бог з саду Эдэмскага, каб урабляў зямлю, зь якое ён узяты... і паставіў... херувіма і палымяны меч..., каб ахоўваць дарогу да дрэва жыцьця”** (Быцьцё 3:23, 24).

## ГЭТА СТАЛА СУМНЫМ ЗДАРЭНЬНЕМ ДЛЯ ЎСЯГО ЧАЛАВЕЦТВА, КАЛІ АДАМ ЗЬ ЕВАЮ ЗГРАШЫЛІ 7



**“... як праз аднаго чалавека грэх увайшоў у сьвет, і праз грэх - сьмерць, так і сьмерць перайшла ва ўсіх людзей...” (**Рымлянаў 5:12).

**Памятай**

**Кожны чалавек** нараджаецца з грахоўнаю прыродай і ў свой час **ён памірае, бо праз грэх прыйшла сьмерць**. (Яшчэ раз прачытай Пасланьне да Рымлянаў 5:12).

## 8 БОГ ПАСЛАЎ СВАЙГО АДЗІНАРОДНАГА СЫНА Ў СВЕТ, КАБ ЗБАВІЦЬ НАС АД ГРАХУ



**“І народзіць Сына, і дасі Яму імя: Ісус, бо Ён уратуе людзей Сваіх ад грахоў іхніх”** (Мацьвея 1:21).

Каб стаць падобным да нас – людзей, Сыну Божаму трэба было нарадзіцца чалавекам.

**“Бо ў Ім жыве ўся паўната Боства цялесна”** (Каласянаў 2:9).

## ІСУС ЁСЬЦЬ БОГ У ЧАЛАВЕЧЫМ АБЛІЧЧЫ 9

**“На пачатку было Слова, і Слова было ў Бога, і Слова было Богам... І Слова стала плоцьцю, і ўсялілася ў нас...”** (Яна 1:1,14а).

**“А ўсё гэта сталася, каб збылося сказанае Госпадам праз прарока, які кажа: «Вось, Дзева ва ўлоньні зачне; народзіць Сына, і дадуць Яму імя: Эмануіл, што азначае: з намі Бог»”** (Мацьвея 1:22, 23).

**“Бо дзіця нарадзілася нам; Сын дадзены нам; уладарства на плячах у Яго, і дадуць імя Яму: Дзівосны, Дарадца, Бог Моцны, Бацька Вечнасьці, Князь Міру”** (Ісаі 9:6).

## 10 ІСУС ХРЫСТОС – ДАСКАНАЛАЯ АХВЯРА ЗА НАС

**“Бо Таго, Хто ня ведаў грэху, Ён зрабіў нам ахвяраю за грэх…”** (2-ое Карынфянаў 5:21).



**“Ня ўчыніў Ён ніякага грэху...”** (1-ае Пятра 2:22а).

Не было такой ахвяры (дасканалай), прынесенай чалавекам, якая б ачысьціла яго ад граху.

**“Бо немагчыма, каб кроў цялят і казлоў зьнішчала грахі”** (Габрэяў 10:4).

Ісус Хрыстос ёсьць Ягня Божае. **“…вось Ягня Божае, Якое бярэ на Сябе грэх сьвету”** (Яна1:29б).

## ІСУС ХРЫСТОС АДДАЎ СВАЁ ЖЫЦЬЦЁ, КАБ УРАТАВАЦЬ НАС 11

Ісус быў расьпяты на крыжы, бо бязьлістасныя людзі ненавідзелі Яго. Але Ягоная сьмерць была Богам заплянаваная. Ісус дабраахвотна аддаў Сваё жыцьцё, каб уратаваць цябе і мяне ад граху.

Ісус сказаў**: “Ніхто не адбірае яго** (жыцьцё) **ў Мяне, а Я Сам аддаю яго: маю ўладу аддаць яго і ўладу маю зноў прыняць яго…”** (Яна10:18б).

**“…ня прахлым срэбрам ці золатам выкуплены вы з марнага жыцьця…, а каштоўнай Крывёю Хрыста, як беспахібнага і чыстага Ягняці”** (1-ае Пятра 1:18,19).

**НЯМА ІНШАЙ АХВЯРЫ, ЯКАЯ Б МАГЛА АЧЫСЬЦІЦЬ АД ГРАХУ**

**“Па гэтай вось волі асьвечаныя мы аднаразовым прынясеньнем Цела Ісуса Хрыста”** (Габрэяў 10:10).

**12 “…калі мы апраўданыя Крывёю Ягонаю, ратуемся Ім ад гневу”** (Рымлянаў 5:9б).

**“… спамяні мяне, Госпадзе, калі прыйдзеш у Царства Тваё”** (Лукаша 23:42б).



Гэты злачынец увераваў у Ісуса і быў уратаваны.

**“…спамяні мяне, Госпадзе, калі прыйдзеш у Царства Тваё”** — (Лукаша 23:42б).

Гэты злачынец не ўвераваў у Ісуса і быў не ўратаваны.

**“… калі мы былі яшчэ грэшнікі, Хрыстос памёр за нас”** (Рымлянаў 5:8б).

## КОЖНЫ, ХТО ВЕРУЕ Ў СЫНА БОЖАГА, МАЕ ЖЫЦЬЦЁ ВЕЧНАЕ 13

**“Бо так палюбіў Бог сьвет, што аддаў Сына Свайго Адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, а меў жыцьцё вечнае”** (Яна 3:16).

**“Вызваліў нас з-пад улады цемры і ўвёў у Царства любаснага Сына Свайго, у Якім мы маем адкупленьне Крывёю Ягонаю і дараваньне грахоў”** (Каласянаў 1:13,14).

## 14 “ЁН УВАСКРОС!”



**“Анёл жа, прамаўляючы да жанчын, сказаў: ня бойцеся вы; бо ведаю, што вы шукаеце Ісуса ўкрыжаванага; няма Яго тут; Ён уваскрэс, як сказаў; падыдзеце, пабачце месца, дзе ляжаў Гасподзь”** (Мацьвея 28:5, 6).

## ІСУС ХРЫСТОС УВАСКРОС ЗЬ МЁРТВЫХ 15

**“І жывы; і быў мёртвы, і вось, жывы на векі вечныя, амін; і маю ключы пекла і сьмерці”** (Адкрыцьцё 1:18).

**“…бо Я жыву, і вы жыцьмеце”** (Яна14:19б).

Хрыстос перамог сьмерць і мае ключы ад пекла і сьмерці, таму баяцца сьмерці болей нам не патрэбна.

**“Калі страх агартае мяне, я надзею кладу на Цябе”** (Псальма 55:4).

(паглядзі на 46-ую старонку, там ты знойдзеш Божыя абяцаньні)

**ІСУС МОЖА ЎРАТАВАЦЬ ЦЯБЕ**

**“А Гэты, як што жыве вечна, мае і сьвятарства непамінушчае, таму і можа заўсёды ратаваць тых, якія прыходзяць праз Яго да Бога, Які заўсёды жывы, каб хадайнічаць за іх”** (Габрэяў 7:24, 25).

16 **МЫ З ТАБОЙ МОЖАМ МЕЦЬ ВЕЧНАЕ ЖЫЦЬЦЁ**




**Якую дарогу выбіраеш ТЫ?**

Ісус Хрыстос - ШЛЯХ да вечнага ЖЫЦЬЦЯ з Богам.

Д’ябал - шлях да вечнай СЬМЕРЦІ.

Гэты хлопчык зрабіў правільны выбар – вечнае жыцьцё.

**ЯКІ ВЫБАР ЗРОБІШ ТЫ?** 17

**“... Дык выберыце сабе сёньня, каму служыць...”** (Кніга Ісуса сына Нава 24:15).

**“Выберы жыцьцё, каб жыў ты і нашчадкі твае”** (Другі закон 30:19б).

**ІСУС ЁСЬЦЬ ШЛЯХ ДА ВЕЧНАГА ЖЫЦЬЦЯ**

**“...і няма ні ў кім іншым ратунку; бо няма другога імя пад небам, дадзенага людзям, якім належала б нам уратавацца”** (Дзеі 4:11б,12).

**“Я, Я - Гасподзь, і няма Збаўцы, апрача Мяне”** (Ісаі 43:11).

18 **ЧАМУ ІСУСА ХРЫСТА МЫ МУСІМ ВЫБРАЦЬ, КАЛІ ХОЧАМ АТРЫМАЦЬ ВЕЧНАЕ ЖЫЦЬЦЁ?**

**1. *Хрыстос прыйшоў на зямлю:***

**“... Я прыйшоў дзеля таго, каб мелі жыцьцё і мелі ўдосталь”** (Яна10:10б).



**2. *Хрыстос палюбіў нас і памёр за нас:***

**“... дык жыву вераю ў Сына Божага, Які палюбіў мяне і аддаў Сябе за мяне”** (Галятаў 2:20б).

Ісус стаў чалавекам, падобным да нас.

**“...каб сьмерцю пазбавіць сілы таго, хто меў уладу сьмерці, гэта значыцца - д’ябла, і выратаваць тых, якія ад страху сьмерці праз усё жыцьцё былі ў рабстве”** (Габрэяў 2:14б,15). 19

**3. *Толькі кроў Ісуса Хрыста можа амыць нашыя грахі.***

**“... бо кроў гэтая душу ачышчае”** (Лявіт 17:11б).

**“... Кроў Ісуса Хрыста, Сына Ягонага, ачышчае нас ад усякага грэху”** (1-ае Яна 1:7б).

**“У Якім мы маем адкупленьне Крывёю Ягонаю і дараваньне грахоў”** (Каласянаў 1:14).

20



**4. *Хрыстос уваскрос зь мёртвых.***

**“Ведаючы, што Хрыстос, уваскрэсшы зь мёртвых, ужо ня ўмірае: сьмерць ужо ня мае над Ім улады”** (Рымлянаў 6:9).

**“А Хрыстос за ўсіх памёр, каб тыя, што жывуць, ужо ня дзеля сябе жылі, а дзеля памерлага за іх і ўваскрэслага”** (2-ое Карынфянаў 5:15).

Ісус сказаў: **“...бо Я жыву, і вы жыцьмеце”** (Яна 14:19б).

**5. *У сабе мы мусім мець Дух Хрыста, каб ажыць для вечнага жыцьця.*** 21

**“...якое багацьце славы ў тайне гэтай для язычнікаў, якая ёсьць Хрыстос у вас, надзея славы”** (Каласянаў 1:27б).

**“Калі ж Дух Таго, Хто ўваскрэсіў зь мёртвых Ісуса, жыве ў вас, дык Той, хто ўваскрэсіў Хрыста зь мёртвых, ажывіць і вашыя сьмяротныя целы Духам Сваім, Які жыве ў вас”** (Рымлянаў 8:11).

**ЦІ ЖЫВЕ ДУХ ХРЫСТА Ў ТАБЕ?**

**“... Калі ж хто Духа Хрыстовага ня мае, той не Ягоны”** (Рымлянаў 8:9б).

## 22 ІСУС ЛЮБІЦЬ УСІХ ДЗЕТАК



**“І абняўшы іх, усклаў рукі на іх і дабраслаўляў іх”** (Марк 10:16).

“Біблія вучыць, што Ісус Хрыстос любіць кожнага больш, чым хтосьці іншы.

23

**“Але Ісус, паклікаўшы іх, сказаў: пусьцеце дзяцей прыходзіць да Мяне і не забараняйце ім, бо такіх ёсьць Царства Божае”** (Лукаша 18:16).

**“Так няма волі Айца вашага Нябеснага, каб загінуў адзін з малых гэтых”** (Мацьвея 18:14).

Хто б ты ні быў і дзе б ты ні жыў, Ісус Хрыстос любіць цябе і за цябе памёр. Ён хоча, каб ты палюбіў Яго. Ты можаш паказваць сваю любоў Яму паслушэнствам.

**“Калі любіце Мяне, захавайце Мае запаведзі”** (Яна 14:15).

**“Можна пазнаць нават падлетка па занятках ягоных: ці чыстыя і ці правільныя ўчынкі ягоныя?”** (Выслоўяў 20:11).

## 24 ЯК ЗНАЙСЬЦІ ШЛЯХ ДА БОГА?

**1.** ***Прызнай сябе грэшнікам, альбо грэшніцай*** *(паглядзі 7-ую старонку).*

**“Бо ўсе зграшылі і пазбаўлены славы Божай”** (Рымлянаў 3:23).

**2.** ***Зьвярніся да Бога праз Ісуса Хрыста.***

**“Бо адзіны Бог, адзіны і пасрэднік паміж Богам і людзьмі, Чалавек Хрыстос Ісус”** (1-ае да Цімафея 2:5).

**“Таму і можа заўсёды ратаваць тых, якія прыходзяць праз Яго да Бога”** (Габрэяў 7:25а).

Ісус сказаў: **“… і таго, хто прыходзіць да Мяне, ня выганю прэч”** (Яна 6:37б).

25

**3.** ***Пакайся ў сваіх грахах*** (пакаяцца – значыць адвярнуцца ад сваіх грахоў, пакінуць грэх, перастаць грашыць).

**“Дык пакайцеся і навярнецеся, каб загладзіліся грахі вашыя”** (Дзеі 3:19).

**“Не марудзіць Гасподзь з выкананьнем абяцаньня... , а доўга трывае нас, ня хочучы, каб хто загінуў, а каб усе прыйшлі да каяньня”** (2-ое Пятра 3:9).




**4.** ***Спавядайся Ісусу ў сваіх грахах.***

**26** На радках унізе напішы вершык зь Першага пасланьня Яна Багаслова 1:9, які знойдзеш на старонцы 25-ай на малюнку “Малітоўныя рукі.”

__________________________________________

__________________________________________

__________________________________________

__________________________________________

**5.** ***Перастань грашыць.***
*(што азначае, адвярніся ад сваіх грахоў).*

**“Той, хто хавае свае злачынствы, ня будзе мець посьпеху; а хто прызнаецца і пакідае іх, той будзе памілаваны”** (Выслоўяў 28:13).

**“Ухіляйся ад благога, і рабі дабро…”** (Псалтыр 36:27а).



**“Бо мілатою вы ўратаваныя праз веру, і гэта не ад вас, - Божы дар: не ад дзеяў, каб ніхто не хваліўся”** (Эфэсянаў 2:8, 9).

**6.** ***Веруй у Ісуса Хрыста.*** **27**

**“Бо калі вуснамі тваімі будзеш вызнаваць Ісуса за Госпада і сэрцам тваім верыць, што Бог уваскрэсіў Яго зь мёртвых, ты выратуешся”** (Рымлянаў 10:9).

**“… веруй у Госпада Ісуса Хрыста, і ўратуешся ты і ўвесь дом твой”** (Дзеі 16:31б).

**28 *7. Прымі Ісуса Хрыста ў сваё сэрца і ў сваё жыцьцё.***

Толькі ты можаш адчыніць дзьверы свайго сэрца і запрасіць Ісуса ўвайсьці туды. Ісус сказаў:



**“Вось, стаю каля дзьвярэй і стукаюся; калі хто пачуе голас Мой і адчыніць дзьверы, увайду да яго і буду вячэраць зь ім, і ён са Мною”** (Адкрыцьцё 3:20).

**“А тым, якія прынялі Яго, веруючым у імя Ягонае, даў уладу быць дзецьмі Божымі”** (Яна 1:12).

## ПРЫКЛАД МАЛІТВЫ 29

Калі ты ніколі ў жыцьці не маліўся і табе патрэбна дапамога, дык можаш маліцца прыкладна так:



**Дарагі Госпад Ісус!**

**Дзякую за тое, што Ты памёр на крыжы за мае грахі. Даруй мне ўсе мае правіны. Прашу ўвайсьці ў маё сэрца і жыць там. Прашу ачысьціць маё сэрца. Цябе прымаю за свайго асабістага Збаўцу і Госпада. Усё гэта малю ў Імя Тваё.**

**Амін.**

## 30 КАЛІ ІСУС ХРЫСТОС ЖЫВЕ Ў ТВАІМ СЭРЦЫ, ТЫ МАЕШ ВЕЧНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**“Сьведчаньне гэтае ў тым, што Бог дараваў нам жыцьцё вечнае, і гэтае жыцьцё ў Сыне Ягоным. Хто мае Сына (Божага), мае жыцьцё…”** (1-ае Яна 5:11, 12а).

**“… хто слухае слова Маё і верыць у Таго, Хто паслаў Мяне, мае жыцьцё вечнае і на суд ня прыходзіць, а перайшоў ад сьмерці ў жыцьцё”** (Яна 5:24б).

Калі цела памірае, душа ідзе да Бога. (2-ое Карынфянаў 5:8).

**“… Хрыстос у вас, надзея славы”** (Каласянаў 1:27б).

Калі ты папрасіў Ісуса дараваць твае грахі, і ўвераваў у Госпада Ісуса Хрыста як свайго Збаўцу, запішы сваё імя на гэтым месцы:

________________________________________

## ЯК ІСЬЦІ ЎСЛЕД ЗА ІСУСАМ 31



Кожны дзень чытай Слова Божае – Біблію і захоўвай яго ў сваім сэрцы; напамяць вывучвай асобныя вершы, якія дапамогуць табе пераадольваць жыцьцёвыя цяжкасьці. (Шмат вытрымак зь Бібліі ты знойдзеш у гэтай маленькай кніжачцы.)

**“Усё Пісаньне боганатхнёнае і карыснае для навучаньня, для выкрыцьця, для выпраўленьня, для настаўленьня ў праведнасьці”** (2-ое да Цімафея 3:16).

## 32 У ЛЮБЫ ЧАС ГАВАРЫ ЗЬ ІСУСАМ МАЛІТВАЙ

За ўсё дзякуйце. ***Дзякуй Ісусу*** за ўсё ў жыцьці. ***Услаўляй Яго*** за ўсё, што Ён зрабіў для цябе, і за тое, што ўратаваў тваю душу. ***Маліся за ўсе свае патрэбы.*** Маліся ў імя Ісуса Хрыста.



**“І вось, якую адвагу мы маем перад Ім, што, калі просім чаго па волі Ягонай, Ён слухае нас”** (1-ае Яна 5:14).**“… чаго ні папросіце ў Айца ў імя Маё, дасьць вам”** (Яна 16:23б).

**“Прызнавайцеся адзін аднаму ў правінах і малецеся адзін за аднаго...”** (Якава 5:16а).

**“… малецеся за крыўдзіцеляў вашых і за ганіцеляў вашых”** (Мацьвея 5:44б).

## МАЛІТВА, ДАДЗЕНАЯ ХРЫСТОМ СВАІМ ВУЧНЯМ 33

(вучань – гэта чалавек, які ідзе ўсьлед за Ісусам)

Ісус вучыў Сваіх вучняў маліцца так:

**“Войча наш, Які ёсьць на нябёсах! Хай сьвяціцца імя Тваё; хай прыйдзе Царства Тваё; хай будзе воля Твая як на небе, так на зямлі; хлеб наш надзённы дай нам сёньня; і даруй нам правіны нашыя, як і мы даруем вінаватым перад намі; і не дапусьці нас да спакусы, але ратуй нас ад ліхога; бо Тваё ёсьць Царства і сіла і слава навекі. Амін”**

(Мацьвея 6:9б-13).

Гэтую малітву трэба ведаць напамяць. Верінікі часта моляцца ўголас гэтай малітвай.

## 34 ДЗЕСЯЦЬ БОЖЫХ ЗАПАВЕДЗЯЎ ВУЧАЦЬ, ЯК НАМ ПАТРЭБНА ЖЫЦЬ

(Кніга Выхад, разьдзел 20)

***Першыя чатыры кажуць пра нашу любоў да Бога:***

1. **“Хай ня будзе ў цябе іншых багоў перад абліччам Маім.”**
2. **“Не рабі сабе куміра і ніякай выявы… не пакланяйся ім і ня служы ім.”**
3. **“Не вымаўляй імя Госпада, Бога твайго, марна.”**
4. **“Але памятай дзень суботні, каб сьвяціць яго.”**

***Апошнія шэсьць кажуць пра нашу любоў да людзей:***

## 10 ЗАПАВЕДЗЯЎ (ПРАДАЎЖЭНЬНЕ) 35

5. **“Шануй бацьку твайго і маці тваю.”**
6. **“Не забівай.”**
7. **“Ня чыні пералюбу.”** (Пералюб ёсьць нявернасьць жонкі, ці мужа).
8. **“Ня крадзь.”**
9. **“Не кажы ілжывага сьведчаньня на блізкага твайго.”**
10. **“Ня прагні… нічога, што ў блізкага твайго.”**

**ПАСЛУХМЯНАСЬЦЬ БОГУ ПРЫНОСІЦЬ НАМ АДКАЗЫ НА НАШЫ МАЛІТВЫ**

**“І, чаго ні папросім, атрымаем ад Яго, бо трымаемся запаведзяў Ягоных і робім богаспадобнае перад Ім”** (1-ае Яна 3:22).

## 36 ДЗЬВЕ НАЙБОЛЬШЫЯ ЗАПАВЕДЗІ

### *Любоў да Бога*

**1. “Ісус жа сказаў яму: «палюбі Госпада Бога твайго ўсім сэрцам тваім, і ўсёю душою тваёю, і ўсім разуменьнем тваім»; гэта найбольшая і першая запаведзь”** (Мацьвея 22:37, 38).

### *Любоў да людзей*

**2. “А другая падобная да яе: «палюбі блізкага твайго, як самога сябе»”** (Мацьвея 22:39).




Усе 10 запаведзяў (старонкі 34 і 35) уключаны ў гэтыя дзьве запаведзі.

## ЛЮБОЎ ЁСЬЦЬ НАЙБОЛЬШАЯ ЗАПАВЕДЗЬ 37

**“Разьдзел любові”**

(1-ае Карынфянаў 13:1-8,13)

**1. Калі я гавару мовамі чалавечымі і анёльскімі, а любові ня маю, дык я - медзь звонкая, альбо кімвал гулкі,**

**2. Калі маю дар прароцтва, і ведаю ўсе таямніцы, і маю ўсякія веды і ўсю веру, так што магу і горы перастаўляць, а ня маю любові, - дык я нішто.**

**3. І калі я раздам усю маёмасьць маю і аддам цела маё на спаленьне, а любові ня маю, - няма мне ў тым ніякай карысьці.**

**4. Любоў церпіць доўга, умілажальваецца, любоў не зайздросьціць, любоў не праслаўляе сябе, не ганарыцца,**

**38** **5. ня бушуе, ня шукае свайго, не раздражняецца, не намышляе ліха,**

**6. ня радуецца зь няпраўды, а разам цешыцца зь ісьціны;**

**7. усё пакрывае, усяму верыць, на ўсё спадзяецца, усё пераносіць.**

**8. Любоў ніколі ня мінаецца, хоць і прароцтвы спыняцца, і мовы змоўкнуць, і веды скасуюцца.**

**13. А тым часам жывуць вось гэтыя тры: вера, надзея, любоў; але любоў зь іх найбольшая.**

**БОГ ЁСЬЦЬ ЛЮБОЎ**

**“… Бог ёсьць любоў, і хто жыве ў любові, той жыве ў Богу, і Бог у ім”** (1-ае Яна 4:16б).

## ІСУС ХРЫСТОС ХОЧА, КАБ ТЫ СЬВЕДЧЫЎ ІНШЫМ ПРА ЯГО 39



(будзь то дома, у школе, на працы, у царкве - усюды)

Ісус сказаў: **“Ідзі дамоў да сваіх і раскажы ім, што ўчыніў з табою Гасподзь і як зь цябе ўмілажаліўся”**

(Марка 5:19б).

## 40 АДЗНАКІ САПРАЎДНАГА БОЖАГА ДЗІЦЯЦІ

**“Па тым пазнаюць усе, што вы Мае вучні, калі будзеце мець любоў між сабою”** (Яна 13:35).

**“А плод Духа: любоў, радасьць, згода, доўгая цярплівасьць, добрасьць, міласэрнасьць, вера, лагоднасьць, устрымлівасьць. . . ”** (Галятаў 5:22, 23а).

**САПРАЎДНАЕ БОЖАЕ ДЗІЦЯ ДАРУЕ ІНШЫМ**

**“Бо калі вы будзеце дараваць людзям правіны іх, дык даруе і вам Айцец ваш Нябесны”** (Мацьвея 6:14).

**РЭЧЫ, ЯКІЯ БОГ НЕНАВІДЗІЦЬ:**

**“Вочы ганарыстыя, язык хлусьлівы і рукі, што праліваюць нявінную кроў, сэрца, якое куе ліхія намыслы, ногі, якія шпарка бягуць да ліхадзейства, ілжывы сьведка, які хлусіць, і той, хто сее разлад між братамі”** (Выслоўяў 6:17-19).

## ДЗЕІ ПЛОЦІ 41




**“. . . пералюбства, блуд, нечыстата, непатрэбства, ідаласлужэньне, чарадзейства, варожасьць, свары, зайздрасьць, гнеў, звады, раздоры (спакусы), ерасі, нянавісьць, забойствы, п’янства. . . і іншае такое. . . , тыя, хто робіць так, Царства Божага не ўспадкуюць”** (Галятаў 5:19а, 20, 21).

**“. . . ні блудадзеі, ні ідалапаклоньнікі, ні перялюбцы, ні мужаложцы, ні гомасэксуалісты, ні зладзеі, ні сквапныя, ні п’яніцы, ні паклёпнікі, ні махляры, – Царства Божага не спадкуюць”** (1-ае Карынфянаў 6:9, 10а) (згодна зь перакладам перакладчыка гэтай кніжачкі).

**ДАЗВОЛЬ ІСУСУ ХРЫСТУ НАПОЎНІЦЬ ЦЯБЕ ДУХАМ СВАІМ І АЧЫСЬЦІЦЬ ЦЯБЕ АД ГРАХОЎ**

**“І такімі былі некаторыя з вас, але абмыліся, але асьвяціліся, але апраўдаліся імем Госпада нашага Ісуса Хрыста і Духам Бога нашага”** (1-ае Карынфянаў 6:11).

## 42 ПЕКЛА – ГЭТА РЭАЛЬНАЕ МЕСЦА




**(Прачытай Дабравесьце паводле Лукаша 16:19—26.)**

Поўнасьцю давярай Ісусу. Ён запіша тваё імя ў кнігу жыцьця.

**“І хто ня быў запісаны ў кнізе жыцьця, той быў укінуты ў возера вогненнае”** (Адкрыцьцё 20:15).

## ШЛЯХ ДА БОГА МАГЧЫМЫ ТОЛЬКІ ПРАЗЬ ІСУСА 43

**“... Бог дараваў нам жыцьцё вечнае, і гэтае жыцьцё ў Сыне Ягоным”** (1-ае Яна 5:11б).

**“Бо расплата за грэх - сьмерць, а дар Божы - жыцьцё вечнае ў Хрысьце Ісусе, Госпадзе нашым”** (Рымлянаў 6:23).

**“Хто верыць у Сына, мае жыцьцё вечнае; а хто ня верыць у Сына, ня ўбачыць жыцьця, а гнеў Божы застаецца на ім”** (Яна 3:36).

**“Ісус сказаў яму: Я - і шлях і праўда і жыцьцё; ніхто ня прыходзіць да Айца, як толькі церазь Мяне”** (Яна 14:6).

## 44 НЕБА – ГЭТА РЭАЛЬНАЕ МЕСЦА



У відзежы Ян убачыў новае неба і новую зямлю, што запісана ў Адкрыцьці ў 21-ым разьдзеле.

**“І ўтрэ Бог кожную сьлязіну з вачэй іхніх, і сьмерці ня будзе ўжо; ні плачу, ні енку, ні хваробы ўжо ня будзе; бо ранейшае прайшло. І сказаў Той, Хто сядзеў на троне: вось твару ўсё новае. . . ”** (Адкрыцьцё 21:4, 5а).

Таксама Ян убачыў сьвяты горад, новы Ерусалім, які сыходзіў ад Бога зь неба.

**“. . . а горад быў чыстае золата, падобны чыстаму шклу. Падмуркі гарадзкога мура ўпрыгожаны ўсялякімі каштоўнымі камянямі…”** (Адкрыцьцё 21:18б, 19а).

## ІСУС ПАЙШОЎ ПАДРЫХТАВАЦЬ МЕСЦА 45 ДЛЯ ТЫХ, ХТО ПАВЕРЫЦЬ У ЯГО

**“Хай не бянтэжыцца сэрца ваша; веруйце ў Бога і ў Мяне веруйце. У доме Айца Майго прыстанішча многа, а калі б ня так, Я сказаў бы вам: Я іду падрыхтаваць месца вам. І калі пайду і падрыхтую вам месца, прыйду зноў і вазьму вас да Сябе, каб і вы былі, дзе Я”** (Яна 14:1-3).

**РАСКАЗВАЙ ГЭТУЮ ДОБРУЮ ВЕСТКУ ІНШЫМ**

Ісус сказаў: **“. . . ідзеце па ўсім сьвеце і абвяшчайце Дабравесьце ўсяму стварэньню”** (Марк 16:15б).

**“. . . мудры яднае душы”** (Выслоўяў 11:30б).

## 46 БОЖЫЯ АБЯЦАНЬНІ ЯГОНЫМ ДЗЕЦЯМ

**“. . . не пакіну цябе і не адступлюся ад цябе”** (Габрэяў 13:5б).

**“Бо анёлам Сваім наказвае пра цябе - ахоўваць цябе на ўсіх дарогах тваіх”** (Псалтыр 90:11).



**“... і ніхто ня можа адабраць іх з рукі Айца Майго” (** Яна 10:29б).

**“...Я з вамі ва ўсе дні да сканчэньня веку...”** (Мацьвея 28:20б).

**“Ня бойся нічога, што табе выпадзе перацярпець... Будзь верны да сьмерці, і дам табе вянок жыцьця”** (Адкрыцьцё 2:10).

**“. . . хоць я ў змроку, але Гасподзь сьвятло мне”** (Міхея 7:8б).

**“Пакліч Мяне - і Я адкажу табе. . . . ”** (Ераміі 33:3а).

## ІСУС У ХУТКІМ ЧАСЕ ВЕРНЕЦЦА НА ЗЯМЛЮ 47

І памерлыя паўстануць з магіл.

**“. . . бо настае час, калі ўсе, хто ў магілах, пачуюць голас Сына Божага, і выйдуць тыя, што тварылі дабро на ўваскрэсеньне жыцьця, а што ліха чынілі - на ўваскрэсеньне асуды”** (Яна 5:28б, 29).

Памерлыя ў Хрысьце ўваскрэснуць першымі.



**“Потым мы, хто застанецца жывы, разам зь імі ўзятыя будзем на воблакі на сустрэчу з Госпадам у паветры, і так вечна з Госпадам будзем”** (1-ае Фесаланікійцаў 4:17).

**“Глядзеце, чувайце, малецеся; бо ня ведаеце, калі настане час гэты”** (Марк 13:33).

## 48 У ЯКІМ ВЫГЛЯДЗЕ І ЯКІМ СПОСАБАМ ВЕРНЕЦЦА ІСУС?



**“Вось, ідзе з хмарамі; і ўгледзіць Яго кожнае вока...”** (Адкрыцьцё 1:7а).

Сьцеражыцеся ілжэхрыстоў і ілжэпрарокаў.

**“Тады калі хто скажа вам: «вось, тут Хрыстос», альбо «там», - ня верце; бо паўстануць ілжэхрысты ды ілжэпрарокі і дадуць азнакі і вялікія цуды, каб увесьці у зман, калі ўдасца і выбраных... Значыцца, калі скажуць вам: «вось Ён у пустыні», - ня выходзьце; «вось, Ён у патайных пакоях», - ня верце”** (Мацьвея 24:23, 24, 26).

**ІСУС ПРЫЙДЗЕ ЗЬ НЕБА НА АБЛОКАХ**

**“Бо, як маланка бліскае з усходу і відна бывае аж да захаду, такі будзе прыход Сына Чалавечага... і тады зьявіцца азнака Сына Чалавечага на небе; і тады заплачуць усе плямёны зямныя і ўбачаць Сына Чалавечага, Які будзе ісьці на аблоках нябесных зь сілаю і славаю вялікай”** ( Мацьвея 24:27, 30).

## ПАСТЫРСКІ ПСАЛОМ

**(Псальма 22)**

1.Гасподзь - Пастыр мой; я ніякай нястачы ня мецьму:
2. Ён пасьвіць мяне на пашах зялёных, на ціхія воды водзіць мяне.
3. Ён душу маю мацуе, кіруе мяне на сьцежкі праўды дзеля імя Свайго.
4. Калі я пайду далінай сьмяротнага ценю, не ўбаюся ліха, бо Ты са мною; Тваё жазло і твой посах - яны супакойваюць мяне.
5. Ты перада мною паставіў трапезу на вачах у маіх ворагаў; намасьціў алеем галаву маю; чара мая перапоўнена.
6. Так, ласка і мілажаль хай будуць са мною ва ўсе дні жыцьця майго, і я буду ў доме Гасподнім многія дні.

Калі Вы жадаеце атрымаць іншыя хрысьціянскія выданьні, то зьвяртайцеся на адрас:

**W. M. Press, Inc.**
**P.O. Box 120**
**New Paris, Indiana 46553-0120 U.S.A.**

Дарагі дружа!
Калі ты жадаеш наведваць хрысьціянскія набажэнствы, то зьвяртайся, калі ласка, ў Царкву, што месьціцца па наступным адрасе:



Выданьне не для продажу. Падарунак. Belarusian WTG